А. А. ТАРНАВЕЦКАЯ
Брэст, ДУА «СШ № 7 г. Брэста»

«ВЫКАРЫСТАННЕ ЭФЕКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎІ ПРЫЁМАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТЭМЫ» СКЛАДАНЫ СКАЗ «У ШКОЛЬНЫМ КУРСЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

Фарміраванне трывалых пунктуацыйных навыкаў – адна з важнейшых задач навучання беларускай мовы. Валоданне пунктуацыйнай граматнасцю мае вялікае агульнакультурнае значэнне, з'яўляецца паказчыкам узроўню маўленчага развіцця чалавека. Пісьмовае маўленне без знакаў прыпынку не дае магчымасці правільна зразумець пісьмовае выказванне, а няправільна ці недакладна пастаўленыя знакі прыпынку абцяжарваюць ўспрыманне напісанага.

У канцэпцыі па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" гаворыцца, што асноўнай задачай навучання беларускай мове ў школе становіцца практычнае засваенне ўсіх асноўных норм беларускай мовы,у тым ліку і пунктуацыйных [1]. Канчатковая мэта навучання пунктуацыі ў школе – сфарміраваць у вучняў пунктуацыйную граматнасць, пад якой разумеецца ўменне таго, хто піша, правільна выкарыстоўваць знакі прыпынку для падзелу сказаў і тэксту на сэнсавыя адрэзкі, а таго, хто чытае, - разумець напісанае.

Працуючы апошнія гады ў старэйшых класах, пастаянна сутыкаюся з вялікай колькасцю пунктуацыйных памылак пры праверцы пісьмовых работ старшакласнікаў, асабліва сачыненняў і пераказаў. Таму лічу неабходным засяродзіць увагу на павышэнні пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў, на трывалым засваенні набытых ведаў у авалоданні моўнымі і маўленчымі нормамі.

На кожным этапе ўрока стараюся прымяняць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы навучання, улічваючы пры гэтым індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў.

Для фарміравання ўмення бачыць і знаходзіць складаныя сказы прапаноўваю вучням гульню "Чацвёрты лішні". Вельмі часта самі вучні складаюць гэту гульню ў якасці дамашняга задання. З мэтай актуалізацыі ведаў вучняў выкарыстоўваю наступныя прыёмы:

- "Ведаю - Хачу даведацца – Даведаўся";
- "Лічбавы дыктант";
- "Завяршы фразу" ("Складаны сказ – гэта…"; "Двукроп'е ў бяззлучнікавым складаным сказе ставіцца, калі…");
- лінгвістычнае паведамленне;
- "Задай пытанне аднакласніку".

Прымяненне гэтых прыёмаўабуджае асобасны матыў навучання, дазваляе выявіць узровень валодання вучнямі тэарэтычным матэрыяламі скарэкціраваць далейшую працу на ўроку.

Прымяняючы прыёмы “Кластар”, “Інсерт” я ствараю ўмовы, у якіх вучні самі набываюць і канкрэтызуюць веды.Кластар – гэта графічная форма адлюстравання вывучаемага ці вывучанага матэрыялу, з дапамогай якой можна лёгка і эфектыўна паказаць сэнсавыя межы пэўнай інфармацыі. Прыём “Інсерт” дапамагае мне арганізаваць самастойную работу вучняў з крыніцай інфармацыі.

Эфектыўным прыёмам для павышэння пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў лічу выкарыстанне тэставых заданняў.Яны садзейнічаюць развіццю ўмення вучняў самастойна ацэньваць свае веды і прымяняць іх на практыцы. У сваёй педагагічнай дзейнасці выкарыстоўваю розныя віды тэстаў: альтэрнатыўны, дыягнастычны, бягучы, выніковы.

Выпрацоўцы пунктуацыйных уменняў і навыкаў вучняў на ўроку садзейнічае праца з тэкстам. Арыентаванасць на тэкст – адзін з кірункаў у выкладанні беларускай мовы ў сучаснай школе. Тэкст з’яўляецца галоўным дыдактычным матэрыялам, на яснове якога вырашаюцца задачы, накіраваныя на засваенне нормаў літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачаецца слоўнік вучняў, забяспечваецца іх выхаванне і развіццё [2]. Для работы на ўроку ў асноўным выкарыстоўваю тэксты мастацкага і публіцыстычнага стыляў.Заданні да тэкстаў прапаноўваю наступныя: знайсці складаныя сказы, пабудаваць іх схемы (або выпісаць складаныя сказы, якія б адпавядалі пэўным схемам), растлумачыць знакі прыпынку, дапісаць тэкст, ужываючы пэўны від складаных сказаў. З мэтай развіцця маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў прапаноўваю работу з дэфармаваным тэкстам: злучыць часткі складаных сказаў, каб атрымаўся звязны тэкст; пераблытаныя вершаваныя радкі паставіць так, каб атрымалася звязнае выказванне.

Эфектыўным сродкам для замацавання вывучанага правіла, выпрацоўкінавыкаў яго прымянення, развіцця пунктуацыйнай пільнасці вучняў з’яўляецца дыктант. Выбар канкрэтнага віду залежыць ад тэмы і мэты ўрока. На сваіх уроках выкарыстоўваю розныя віды дыктантаў: папераджальны, каменціраваны, выбарачны, зрокавы, слыхавы, графічны, творчы.

Навучанне пунктуацыі павінна суправаджацца пастаяннымі практыкаваннямі, накіраванымі на развіццё ў школьнікаў слыху, умення адрозніваць змены голасу, паколькі гэтыя змены звязаны з абазначэннем меж чляненння тэксту знакамі прыпынку [3]. Развіццю гэтага навыку садзейнічае прыем “Шыфроўка”.Вучні павінны на слых успрыняць сказ і

ўпісаць у клетку пад нумарам сказа толькі знак прыпынку, які неабходна паставіць паміж часткамі складанага сказа.

На розных этапах урока выкарыстоўваю такі прыём, як пунктуацыйны разбор, які можа быць поўным ці выбарачным.

Эфектыўным лічу выкарыстанне вучнямі апорных канспектаў, таму што яны дапамагаюць больш якасна засвоіць важны тэарэтычны матэрыял, лёгка знайсці і паўтарыць правілы, вывучаныя раней, а ў старэйшых класах падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання.

На этапе абагульнення і сістэматызацыі выкарыстоўваюнаступныя прыёмы:

- “Белыя плямы” (вучням даецца заданне ўзнавіць прапушчаныя словы ў тэксце);
- міні - тэст
- гульня “Карэктар” (падбіраю сказы, тэксты з загадзя запланаванымі памылкамі, колькасць якіх называю вучням; трэба знайсці і выправіць пунктуацыйныя памылкі, аргументаваць свой выбар; даю такія заданні як для індывідуальнай працы, так і для працы ў групах, парах).

Практыкаванні па фарміраванні пунктуацыйных навыкаў вучняў разнастайныя, але ўсе яны накіраваны на выпрацоўку трывалых пунктуацыйных ведаў у вучняў.

Працуючы па дадзенай тэме, я прыйшла да высновы, што выкарыстанне разгледжаных метадаў і прыёмаў на ўроках беларускай мовы спрыяе павышэнню пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў, дапамагае авалодваць пунктуацыйнымі нормамі беларускай мовы, садзейнічае паспяховай падрыхтоўцы вучняў да экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання.Граматна падабраныя практыкаванні актывізуюць дзяцей на ўроку, робяць іх працу разнастайнай, што дапамагае якасна засвоіць і замацаваць тэарэтычныя веды, сфарміраваць пунктуацыйныя ўменні і навыкі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская мова”: зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.05.2009 № 675.

2. Вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання “Беларуская мова. Беларуская літаратура V - IX класы”. - Мн., Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017.

3. Варановіч, З.Б. Методыка выкладання беларускай мовы: Вучэбны дапаможник. 2-е выд., выпр. і дап. -Мн.: Універсітэцкае, 1995. - 248 с.